# З непаўярхоўным поглядам на звыклае

**Бібліятэка можа быць прыдатнай пляцоўкай для экспанавання прафесійных твораў мастацтва. Апошнім часам да такога фармату ўсё часцей звяртаюцца некаторыя кніжніцы Мінска і рэгіёнаў. Аднак не кожны мастак пагодзіцца на такую прастору для выстаўкі. Ды і ці падыдуць для гэтага творы любога жанру і стылю? Эксперыменты ў гэтым кірунку адкідваюцца, таму ў бібліятэках можна сустрэць пераважна пейзаж і нацюрморт. Здараецца, перад гледачом паўстаюць абстракцыі.**

Да 1 мая ў галерэі «Лабірынт» (3 паверх Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) будзе працаваць выстаўка «На мяжы рэальнасці», прымеркаваная да 65-годдзя Рыгора Мяжуева. Экспазіцыя падрыхтавана ў рамках Года міру і стваральнай працы. Так, гледача знаёмяць з беларускімі пейзажамі і класічнымі нацюрмортамі, а таксама з абстрактнымі кампазіцыямі. На працягу ўсяго творчага шляху мастак імкнецца паяднаць эксперымент і класіку. Паняцце «мяжа», выкарыстанае і ў назве выстаўкі, вельмі дарэчы.

Рыгор Мяжуеў — выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага пединстытута (цяпер — Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава). Вучыўся ў Алега Арлова, Івана Сталярова, Пятра Анашчанкі. Працуе ў жывапісе і акварэлі ў жанрах пейзажа, нацюрморта і партрэта. З 1996 г. прымае ўдзел у шматлікіх беларускіх мастацкіх выстаўках акварэлі і зборных выставачных праектах. Мастак выкладае малюнак і кампазіцыю ў гімназіі-каледжы мастацтваў у Маладзечне.

У цэнтры ўвагі Рыгора Васільевіча — прырода, былыя фальваркі і старыя замкі. «Кранальныя, цёплыя беларускія краявіды, камерныя, рамантычныя нацюрморты выкананы з бездакорным майстэрствам і глыбокай павагай да беларускай гісторыі і традыцый, — адзначаюць у НББ. — Мінулае паўстае як бы застылым у часе, з адценнем настальгіі, асэнсаванасці сённяшняга дня. Мовай геаметрычных фігур, прыгажосцю сіметрыі, гармоніяй ліній перакрыжаванняў і паралеляў, колераў і адценняў мастак у абстрактных работах перадае сваё ўяўленне аб сусвеце». Гэта дастаткова падрабязнае апісанне творчасці майстра акварэлі, да якога складана штосьці дадаць. Сапраўды, Рыгор Мяжуеў выступае як тонкі назіральнік, якому нецікавы



*Фрагмент экспазіцыі.*

павярхоўны погляд на звыклае. Да таго ж ён імкнецца адлюстраваць не толькі навакольны свет, але і ўнутраны (гэтым асобным прасторам таксама выдатна падыходзяць катэгорыі «мяжа», «сумежжа»). Дапамагаюць яму ў гэтым нават пейзажы, да якіх звяртаецца ледзь не кожны акварэліст ці графік. Шмат увагі творца надае куточкам, звязаным з Янкам Купалам і Максімам Багдановічам. Сярод любімых мясцін — маладзечанскі край. Тэматыка, здаецца, болей чым распрацаваная, але падыход Рыгора Мяжуева здольны прыцягнуць увагу, схіліць да роздуму.

**Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара**